Евароўская С. В., студ. гр. 311 ФКіСКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Спірына А.А.,
канд. культуралогіі

**УПЛЫЎ КУЛЬТУРЫ АДРАДЖЭННЯ НА СТАНАЎЛЕННЕ ДУХОЎНАСЦІ СУЧАСНАГА БЕЛАРУСА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускі культурна-гістарычны шлях нельга назваць лінейным, ён не пазбег пэўных сэнсавых супярэчнасцяў. Шматнацыянальнасць і шматканфесійнасць, неакрэсленасць межаў, непаслядоўная змена цэнтраў улады і ўплыву наклалі свой адбітак на сённяшняе ўспрыманне Беларусі як у айчынных, так і ў замежных навуковых колах. Найбольш часта сустракаецца меркаванне аб Беларусі як аб нейкай часцы ад пэўнага цэлага культурна-гістарычнага пласта альбо як аб адсотку ад дакладнай тэрыторыі. Нярэдка ўвогуле адмаўляецца феномен самабытнай беларускай культуры як суверэннай раўнапраўнай складальнай агульнасусветнай культурна-эстэтычнай рэчаіснасці, і яна пачынае ўспрымацца ў свядомасці ўсяго толькі ў якасці варыяцыі “больш развітых” суседніх культур. Такі памылковы погляд з’яўляецца ў сувязі са складанасцю прасочвання за развіццём і ўкараненнем у сённяшнія рэаліі той самай “беларускасці”, а менавіта нацыянальнай самаідэнтыфікацыі і самавызначэння беларуса. І толькі ў эпоху Адраджэння размытыя гістарычныя прасторавыя і часавыя рамкі займаюць свае належныя месцы. XVI стагоддзе на Беларусі становіцца тым самым безапеляцыйным доказам, які сцвярджае існаванне ўласнай асаблівай культурнай мадэлі, пэўнай філасофска-нацыянальнай канцэпцыі. У эпоху беларускага Адраджэння рэлігійныя супярэчнасці разам з вайсковымі справамі адыходзяць на другі план, што адразу дае значны штуршок для развіцця культурна-эстэтычнай сферы. Вялізарным вынаходніцтвам гэтага перыяду становіцца кнігадрукаванне, якое ў сваю чаргу даволі хутка стварае ўстойлівую літаратурна-асветніцкую сістэму зварота. Таксама менавіта з кнігадрукаваннем было звязана распаўсюджванне і развіццё мецэнатскай дзейнасці, адной з пашыраных у сучаснаці форм фінансавання культуры. Так,

адкрыццё друкарняў было перш за ўсё звязана з імёнамі магнатаў і буйных феадалаў ВКЛ. Напрыклад, з 1550 да 1570 года дзейнічала першая друкарня на Беларусі пад апекай Мікалая Радзівіла Чорнага, дзе ў 1563 годзе на яго сродкі была выдадзена Біблія, больш вядомая пад назвай Радзівілаўская. Кнігадрукаванне значна пашырала магчымасці для развіцця перш за ўсё пісьменнай беларускай мовы. У 1562 годзе была надрукавана першая кніга на беларускай мове - "Катэхізіс" Сымона Буднага. Эпоху Адраджэння дакладна можна назваць першай вехай сапраўднага росквіту роднай мовы, якая стала ў гэты час афіцыйнай мовай дзяржаўнага і заканадаўчага апарату. Менавіта на беларускай мове былі выдадзены Статуты ВКЛ, якія ў наш час прызнаны найбольш фундаметальнымі дакуметальнымі звесткамі аб адміністратыўным уладкаванні гэтай дзяржавы.

Нягледзячы на тое, што тэматыка друкаваных тэкстаў была пераважна рэлігійнай, суб'ектыўная пазіцыя аўтара прасочваецца між радкоў, пачынаюць перадавацца дакладныя пачуцці патрыятызму, гонару за Радзіму, пэўныя адносіны да сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў дзяржаве. Увогуле, тэкставая спадчына з'яўляецца асновай для фарміравання вобліка і уяўленняў аб эпохе беларускага Адраджэння, якія паспяхова праецыруюцца на сучасную рэальнасць у свядомасці беларуса.

Да асаблівасцей беларускага Рэнесансу адносяцца згладжаныя, у параўнанні з заходнееўрапейскім вопытам, адносіны паміж свецкім і рэлігійным пачаткамі. Працэс секулярызацыі ішоў памяркоўна, сінхранізавана з патрэбнасцямі эпохі. Трэба адзначыць, што 1520 - 1560-я годы лічацца "залатым векам" ВКЛ, часам рэлігійнай талерантнасці і верацярпімасці. У 1563 годзе быў адменены артыкул Гарадзельскага прывілея, і асобы праваслаўнага і каталіцкага веравызнання сталі роўныя ў сваіх правах. На фоне такога зацішша паступова складаўся сённяшні міжканфесіянальны воблік беларускага грамадства, талерантнасць з цягам часу станавілася якасцю асобы. У 1573 годзе на Варшаўскай канфедэрацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

была канчаткова зацверджана свабода веравызначэння. Неабходна адзначыць, што афіцыйнае зняцце рэлігійнага бар'еру значна паспрыяла з'яўленню размежавання паміж уласна культурным і палітыка-ідэалагічным асяроддзем у дзяржаве. Светапогляд і светаўспрыманне ВКЛ становяцца мнагавектарнымі, што ў тэратарыяльным плане азначае адчыненасць культуры, мастацва, філасофіі краіны як усходняй частцы Еўропы, так і заходняй, якія ў сваёй большасці былі размежаваны менавіта па рэлігійным уяўленням. У XVI стагоддзі Беларусь сапраўды ўспрымаецца як самастойны раўнапраўны актар міжнародных адносін, як самадастатковая частка агульнаеўрапейскай прасторы. Характар культурных міжнарожных зносін можна акрэсліць як узаемаўплыў і раўназначнае ўзаемаабагачэнне паміж культурай ВКЛ і шэрагам суседніх культур. Няглядзячы на тое, што асноўны канцэпт эпохі Адраджэння быў закладзены ў Заходняй Еўропе і праз некаторы час быў паспяхова пераняты культурнай элітай ВКЛ, што дакладна знайшло сваё выяўленне ў выбухным росквіце мастацтва, літаратуры, архітэктуры, скульптуры, нацыянальна-беларуская афарбоўка стала значнай асаблівасцю гэтага перыяду, і дазваляе сёння гаварыць аб уласнабеларускай мадэлі Рэнесансу, што стала заканамерным адказам на запатрабаванні часу і самой нацыі.

Эпоха Адраджэння ў сучаснасці – гэта перш за ўсё ідэальны семантычны воблік, які на самой справе стаў даступны нам толькі ў XX стагоддзі. Узнёслы характар гэты перыяд набывае з-за пэўнай фільтрацыі супярэчлівага становішча тагачаснага сярэдняга жыхара ВКЛ, аддзяленні культурна спадчынных наслаенняў ад сукупнасці сацыяльна-эканамічных фактараў. Элітарны Рэнесанс існаваў ў розных вымярэннях з "зямельным" насельніцтвам краіны XVI стагоддзя, яго характар і дасягненні маюць значны ўплыў менавіта на сённяшнюю Беларусь, якая ўвабрала іх у сябе не праз традыцыю і пакаленную сувязь, а праз пэўны рэзкі скок з сучаснасці ў мінулае з дапамогай матэрыяльных носьбітаў культуры Адраджэння. Гэтая эпоха нясе ў сябе агульны, дзесьці стэрыатыпічны воблік беларуса, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ствараўся культурнай элітай XVI стагоддзя, а сёння можа быць распаўсюджаны на сучасныя масы. У гэтым, на нашу думку, і знаходзіцца прывабнасць і нейкі рамантызм гэтага перыяду, пастулаты якога, нягледзячы на сваю аддаленасць у часе, усё яшчэ развіваюцца, аналізуюцца і застаюцца зразумелымі. Адраджэнне апынаецца ў нашым разуменні эпохай узлёту, гонару за Беларусь, і менавіта гэтыя ўяўленні першасортнасці павінны быць закладзены і ў імідж сённяшняй айчыннай культуры, і ў суб'ектыўнае ўспрыманне прыналежнасці да беларускай нацыі. Трэба яшчэ раз адзначыць, што спадчына Рэнесанса выяўляецца не толькі ў велізарным культурным багацці, але і ў закладзеным у гэты час падмурку не проста чалавека беларускага паходжання, а менавіта беларуса, як носьбіта ўласнай культуры, мовы, тэрыторыі, гісторыі і менталітэту.

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Бярозкіна, Н. Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.) / Н. Ю. Бярозкіна. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – 199 с.
2. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т. / В. Б. Евароўскі [і інш.]; рэд. кал.: В. Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларуская навука, 2010. – Т. 2. Протарэнесанс и Адраджэнне. – 976 с.
3. Падокшын, С.А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI-XVII вв. / С.А. Падокшын. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 149 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ